травматизму органа зрения, мерам его предупреждения и возможным последствиям в случае несоблюдения этих мер.

Нередки нарушения структуры органа слуха и связанные с ними нарушения слуховой функции. Наиболее частыми их причинами являются несоблюдение профилактических норм (чистота органов, уменьшение его переохлаждения, снижение травматизма, шумов и др.).

В разделе "Органы кроветворения и иммунной защиты" рассматриваются возможные отклонения в их строении в ответ на травмы, интоксикации, голодание, действия повреждающих факторов внешней среды.

Наряду с изложением данных, касающихся отклонения в строении органов и систем организма при действии на него факторов внешней и внутренней среды, рассматриваются и наиболее часто встречаемые аномалии, возникающие в ходе его развития, их причины и профилактика.

Таким образом, изучение курса "Анатомии человека" на всех отделениях факультетов естествознания и народной культуры ведется в аспекте пропаганды здорового образа жизни. Параллельно с изложением материалов, касающихся нормального строения органов и систем организма, изучаются и возникающие в них отклонения, причины которых анализируются в плане проведения профилактических мероприятий.

### *Литература*


1. Брехман И. И. Валеология — наука о здоровье. М., 1990.
2. Дубровский В.И. Валеология. Здоровый образ жизни. М., 1999.
3. Здоровье и образование. Проблемы педагогической валеологии. СПБ., 1955.
4. Карсаевская Т. В. Социальная и биологическая обусловленность в физическом развитии человека. Л., 1970.
5. Нестерова Е. В. Валеология. М., 1999.



***І. А. Андарала***


## АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКАЎ-ГЕОГРАФАЎ ВА ЎМОВАХ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

Гісторыя завочнай педагагічнай адукацыі ў нашай краіне пачалася з 1932 года, калі Народны камісарыят асветы рэспублікі прыняў рашэнне аб арганізацыі завочных сектараў пры ўсіх вышэйшых і сярэдніх педагагічных установах.

Сацыяльнае значэнне падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў без адрыву ад працы ў школе з году ў год узрастала ў адпаведнасці з патрабаваннямі да ўзроўню адукацыі насельніцтва. Асабліва бурным перыядам развіцця вышэйшай завочнай педагагічнай адукацыі з'яўляюцца 1929—1938 гады. Натуральнае рэзкае скарачэнне вышэйшай завочнай адукацыі, у тым ліку і педагагічнай, адбылося ў сувязі з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Аднак ужо пачынаючы з 1945—46 навучальнага года назіраецца хуткі рост сістэмы завочнай педагагічнай адукацыі

Аб гэтым красамоўна сведчыць той факт, што 70,7% кантынгенту педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў складалі студэнты-завочнікі.

Пытанні вышэйшай завочнай адукацыі заўсёды былі ў цэнтры ўвагі дзяржавы і ўрада. Падрыхтоўцы спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці былі прысвечаны пастановы Саўнаркама СССР "Аб вышэйшым завочным навучанні" (29 жніўня 1938 г., № 951); Савета Міністраў СССР "Аб завочнай падрыхтоўцы спецыялістаў" (29 красавіка 1946 г, № 968); "Аб далейшым паляпшэнні вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай завочнай і вячэрняй адукацыі" (9 красавіка 1964г., № 285); "Аб далейшым удасканаленні падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй без адрыву ад вытворчасці" (15 чэрвеня 1981 г., № 552) і іншыя.

За амаль семдзесят гадоў свайго існавання вышэйшая завочная педагагічная школа ператварылася ў важнейшае звяно педагагічнага адукацыйнага комплексу. Сёння завочная падрыхтоўка настаўнікаў па розных спецыяльнасцях ажыццяўляецца ў педагагічных вышэйшых навучальных установах і педагагічных факультэтах усіх універсітэтаў рэспублікі. Кожныя два з пяці студэнтаў-педагогаў з'яўляюцца завочнікамі.

За доўгі час існавання ў завочнай форме адукацыі адбыліся значныя змены як у якасных, так і ў колькасных характарыстыках. Так, напрыклад, на першых этапах станаўлення развіцця вышэйшай завочнай педагагічнай школы асноўны кантынгент студэнтаў складалі практыкі, якія мелі даволі значны педагагічны вопыт. У наш час колькасць студэнтаў-завочнікаў, што працуюць па той спецыяльнасці, якую атрымліваюць (акрамя факультэтаў, адпаведных педагагічным каледжам) рэзка знізілася. Так, на завочным аддзяленні факультэта прыродазнаўства БДПУ імя М. Танка (спецыяльнасць "Геаграфія") настаўнікі геаграфіі складаюць толькі 10% ад агульнай колькасці студэнтаў-завочнікаў.

Завочнае аддзяленне па падрыхтоўцы настаўнікаў геаграфіі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка было створана пры факультэце прыродазнаўства ў 1982 годзе. Першы набор склаў 50 чалавек. Сёння на завочным аддзяленні займаецца каля трохсот студэнтаў. За 18 гадоў праз завочную форму навучання было падрыхтавана каля васьмісот настаўнікаў-географаў.

Вучэбны працэс па спецыяльнаму блоку дысцыплін на завочным, як і на дзённым аддзяленні, ажыццяўляюць выкладчыцкія калектывы дзвюх кафедраў: кафедра фізічнай геаграфіі і кафедра эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі.

З'яўляючыся падсістэмай агульнай сістэмы навучання ў вышэйшай школе, завочнае навучанне ўтрымлівае ў сабе многія ўласцівасці гэтай сістэмы. Аднак, як сведчаць шматлікія даследаванні, сляпое капіраванне тэорыі і практыкі стацыянарнага навучання і перанос яго на завочную форму не спрые эфектыўнасці падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. Наспеў час навуковага аналізу агульнага і спецыфічнага для гэтых формаў падрыхтоўкі будучых настаўнікаў з мэтай выпрацоўкі навуковага падыходу да пошуку новых шляхоў удасканалення завочнага навучання. На наш погляд, тэарэтычная распрацоўка гэтых шляхоў павінна ахапіць у комплексе ўсе

структурныя элементы (мэта, змест, формы, метады, сродкі навучання, кантроль за вучэбнай дзейнасцю студэнтаў).

Падрыхтоўка настаўнікаў геаграфіі ва ўмовах завочнага навучання мае шмат агульнага са стацыянарным навучаннем. У прыватнасці, у іх адзіная мэта і адзіны змест навучання. У той жа час навучанню без адрыву ад вытворчасці ўласціва спецыфіка і асаблівасці. Прычым, гэта спецыфіка і асаблівасці маюць як пазітыўны, так і негатыўны характар. Завочнае навучанне ажыццяўляецца ў зусім іншых умовах, чым стацыянарная форма навучання. Гэта і спецыфічны кантынгент студэнтаў, і меншы аб'ём часу, і зусім іншая арганізацыя вучэбнага працэсу. Вучэбны план завочнага аддзялення прадугледжвае скарочаную, у параўнанні з дзённым навучаннем, колькасць гадзін на непасрэдную працу студэнта з выкладчыкам. Так, з 259 працоўных дзён вучэбнага года пад непасрэдным кіраўніцтвам выкладчыкаў студэнт-завочнік працуе толькі 40 дзён: 10 дзён на зімовай сесіі і 30 — на летняй, калі не лічыць сустрэч з выкладчыкамі на кансультацыях у дні завочніка. Такім чынам, больш за дзвесце дзён (прыкладна 80% агульнага бюджэту часу) завочнік павінен займацца самастойна, па-за межамі аўдыторыі.

Трэба адзначыць, што правільная арганізацыя самастойнай працы студэнтаў мае рашаючае значэнне для ўсіх формаў навучання. Аднак для студэнтаў-завочнікаў праблема арганізацыі самастойнай працы ў міжсесійны перыяд з'яўляецца самай галоўнай і важнай праблемай.

На жаль, як паказала праведзенае намі апытанне студэнтаў-завочнікаў геаграфічнага аддзялення, яны недастаткова гатовы рацыянальна арганізаваць сваю вучэбную працу ў міжсесійны перыяд. Асабліва гэта адзначаюць студэнты першага і другога курсаў.

Самастойная праца студэнтаў-завочнікаў, з'яўляючыся асноўнай формай яго падрыхтоўкі, непарыўна звязана з іншымі формамі навучання. Гэта ставіць перад педагагічнай навукай і практыкай праблему размеркавання вучэбнага матэрыялу для аўдыторных і самастойных заняткаў, пошуку спосабаў больш рацыянальнага выкладання асноўнага зместу вучэбных дысцыплін у перыяд сесій.

*Н. М. Вагнер, Е. В. Ефременко,*
*В. Н. Нестерович, О. Ю. Панасюк*

## ОСОБЕННОСТИ ФОРМИРОВАНИЯ СИСТЕМЫ ЗНАНИЙ В КУРСЕ «ОБЩЕГО ЗЕМЛЕВЕДЕНИЯ»

Определяя пути совершенствования системы знаний курса общего землеведения, мы исходили из следующих положений:

1. Общее землеведение изучает географическую оболочку (ГО) в качестве объекта исследования. Предмет исследования — та же ГО, но как глобальная геосистема, как природно-территориальный комплекс (ПТК) планетарного масштаба, все компоненты которого тесно взаимосвязаны, взаимообусловлены.